экз 3260 02 234
Библиотека АН БССР

Смерць нямецкім захопнікам!

Прачытаў — перадай другому

# Ленінец

Партызаны і партызанкі!

Яшчэ мацней біце ворагаў нашай радзімы.

З кожным днём памнажайце гэты слаўны баявы рахунак!

Орган Плешчаніцкага РК КП(б)Б і Н-скага партызанскага злучэння

№ 30 (847) ПАНЯДЗЕЛАК, 10 красавіка 1944 г. Год выдання 2-гі.

## ПАРТЫЗАНАМ АТРАДА „БАРБА“

Партызаны і партызанкі, камандзіры і палітработнікі, ў дзень двухгоддзя вашага існавання і барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Плешчаніцкі падпольны РК КП(б)Б шле Вам палкае бальшэвіцкае прывітанне і жадае далейшых поспехаў у вашай барацьбе з праклятым ворагам на карысць нашай Радзімы.

РК КП(б)Б упэўнен, што Вы яшчэ больш узмоцніце свае ўдары па ворагу і сваімі баявымі справамі дапаможаце наступаючай гераічнай Чырвонай Арміі хутчэй ачысціць нашу Савецкую зямлю ад фашысцкай погані.

Няхай жывуць слаўныя партызаны і партызанкі!

Смерць і помста нямецкім акупантам!

Плешчаніцкі падпольны РК КП(б)Б

## Слава мужным і бясстрашным

Больш 2-х з палавінай год прайшло з тых пор, як на заклік нашага любімага Правадыра тав. СТАЛІНА падняўся наш беларускі народ на свяшчэнную барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Па заданню партыі лепшыя людзі нашай радзімы партыйныя і не партыйныя бальшэвікі засталіся ў тылу для разгортвання ўсенароднай партызанскай вайны. З кожным днём усё больш і больш разгаралася полымя партызанскай барацьбы.

Партызанскі рух зарадзіўся і вырас у самым народзе. Ён выклікан нянавісцю савецкага народа к гітлераўскім захопнікам, імкненнем савецкіх людзей захаваць свабоду і незалежнасць роднай краіны, абараніць ад лютага ворага свой дом сям'ю і маёмасць. На барацьбу з нямецкімі катамі падняліся сотні тысяч савецкіх людзей—рускіх, украінцаў, беларусаў і іншых народаў акупіраваных абласцей Савецкага Саюза.

Сваёй барацьбой ў тылу ворага партызаны аказваюць вялікую дапамогу гераічнай Чырвонай Арміі. Толькі атрад „Барба“, дзейнічаючы ў адным з раёнаў Мінскай обл., знішчыў звыш 4000 фрыцаў.

Партызаны — гэта лепшыя сыны і дочкі савецкага народа, выступіўшыя на актыўную, свяшчэнную барацьбу з нямецкімі забойцамі. Партызаны помсцяць ворагу за ўсе ўчыненыя ім злачынствы, за муку, кроў і слёзы савецкіх людзей.

Чырвоная Армія громіць нямецкія полчышчы, гоніць ворага на захад, наносячы яму вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы.

Войскі 1-га і 2-га Украінскіх франтоў ужо ваюють на тэрыторыі Румыніі і занялі некалькі гарадоў і населеных пунктаў. Гераічная Чырвоная Армія заканчвае выгнанне нямецка-фашысцкіх акупантаў з усходняй Украіны. Нашы войскі знаходзяцца ў 13 км. ад г. Одэсы. Блізіцца разгром ворага.

Слава гераічнай Чырвонай Арміі!

Слава партызанам і партызанкам!

Смерць і помста нямецкім акупантам!

## На франтах Айчыннай вайны

### З аператыўнай зводкі за 8 красавіка 1944 г.

На працягу 8 красавіка на захад ад гор. Скалат нашы войскі вялі баі па знішчэнню акружанай групіроўкі праціўніка.

Войскі 1-га Украінскага фронта, развіваючы наступленне, зайшлі ў прадгор'е Карпат, выйшлі на Румынскую і Чэхаславацкую граніцы даўжынёй па фронту да 200 км., занялі гарады Пецянішын, Вашкаўцы і звыш 300 населеных пунктаў. На тэрыторыі Румыніі занята звыш 30 населеных пунктаў і адзін румынскі горад.

Войскі 2-га Украінскага фронта фарсіравалі раку Прут на поўнач ад гор. Яссы даўжынёй па фронту 170 км., выйшлі к раце Сярэт даўжынёй па фронту 85 км. і занялі гарады на румынскай тэрыторыі Дарашаі, Баташэні і звыш 150 населеных пунктаў.

На Одэскім напрамку нашы войскі занялі звыш 30 населеных пунктаў і знаходзяцца ў 13 км. ад Одэсы.

На поўнач ад г. Раздзельная нашымі войскамі закончана ліквідацыя акружанай групіроўкі праціўніка. Узята ў палон звыш 3.200 салдат і афіцэраў. Засталося на полі бою звыш 7.000 трупаў нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплены трафеі: танкаў—40, самаходных гармат—5, гармат—188, кулямётаў—284, коней 1000.

За 7 красавіка знішчана 41 танк і 92 самалёты праціўніка.

жр 3260



# „БОРЬБА"

(Дню 2-й годоўшчыны п.-о. „Борьба": посвяшчаю)

В сорок первом году
всем врагам на беду
Наш отряд боевой зароділся,
І позднее потом,
в году сорок втором
Славным іменем он окрестілся.
І вот есть у меня
тех людей імена,
Кто впервые поднял наше знамя.—
Наше знамя борьбы
против черной орды,
Оно реет сегодня над намі.
Ясіновіч Іван
із-за фронта пріслан
Для работы в тылу у фашістов,
Нігде страха не знал,
он народ поднімал,
Он растіл молодых коммуністов.
Патріоты страны
і отчізны сыны:
Ненахов, Філатов, Красненко,
Котляров і Долганов Сергей
собіралі друзей,
Сколотілі ударную группу
І прізвалі к себе,—
к беспошчадной борьбе
Много нашего честного люду.
І Петровіч Роман—
боевой партізан,
Он достоін почетного імя
Не отставая нігде:
ні в бою, ні в труде,
І он также вместе был с німі.
Ні метель, ні пурга,
ні угрозы врага
Іх нічто нікогда не пугало,
І ні голод ліхой
іх холодной зімой
Покоріться врагу не заставіл.
А потом уж „Борьба",
как на страх для врага,
Превратілася в грозную сілу.
Не одін оккупант,
а тысяч несколько іх
От „Борьбы" полеглі уж в могілу.
Не одін паровоз
полетел под откос,
Наскочів на борьбовскую міну.
Із засад і в бою,
зная смелость свою,
Не одну ты громіла машіну.
Знайте ж, фріцы, всегда,
что все крепнет „Борьба",
І ударі её всё сільнеют.
Бей „Борьба" по врагу!
да і я помогу,
Пусть фашістскіе кості здесь тлеют.
І оценіт тогда
нас всех Родіна—мать,
Скажет слово Велікій наш Сталін.—
І это будет тебе,—
Кто так честно в борьбе
Свое імя навекі прославіл.
Слава нашей „Борьбе"!
командір,—і тебе,
Коміссару і всем тем героям,
Кто так смело с тобой
ідёт в решітельный бой
Вечной славы он будет достоін.

Д—н.

## Па Савецкаму Саюзу

5 лютага 1944 г. савецкія газеты апублікавалі „Справаздачу Камітэта пры Соўнаркоме Саюза ССР па аднаўленню гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі".

За кароткі тэрмін насельніцтва вызваленых ад нямецкай акупацыі раёнаў атрымала 1.723.201 галаву жывёлы.

Каб своечасова засеяць азімы клін, Савецкі Урад адпусціў 96.324 тоны насення.

На папялішчах адноўлен і пабудаван занова 326.451 дом.

У ачышчаных раёнах, Савецкі Урад поўнасцю вызваліў ад усіх відаў паставак сельскагаспадарчых прадуктаў больш мільёна гаспадарак.

Па бюджэту на 1944 г. адпушчана каля 16 мільярдаў рублёў для аднаўлення гаспадаркі ў вызваленых ад ворага раёнах.

## СЛАЎНЫ ЮБІЛЯР

У той час, калі нямецка-фашысцкія грабежнікі напалі на нашу краіну, лепшыя людзі—патрыёты радзімы групамі пайшлі ў лясы, узброіліся і пачалі помсціць нямецкім акупантам за спаленыя імі гарады і сёлы, за забітых і спаленых нашых бацькоў, братоў, сясцёр і дзяцей. Вось з такіх людзей, 2 гады таму назад, утварыўся атрад „Барба", які к сёнешняму дню вырас у грозную для ворага сілу. З'яўленне атрада ў любым раёне заставаўляла немцаў дрыжаць.

К сваму юбілею атрад прыйшоў з вялікімі дасягненнямі. Сіламі атрада спушчана пад адкос 43 эшалоны з жывой сілай, тэхнікай і іншай ваеннай маёмасцю ворага. Знішчана звыш 40 аўтамашын. Спалена 30 цыстэрн з гаручым. Знішчаны 2 самалёты і многа іншай тэхнікі ворага. Знішчана больш 15 валасных упраў і маслазаводаў, звыш 20 шасейных і чыгуначных мастоў. Пры ўдзеле атрада разгромлена некалькі варожых гарнізонаў. Шмат баёў вёў атрад з ворагам, абараняючы насельніцтва ад нямецкіх грабежнікаў. У адкрытых баях і шляхам узрываў цягнікоў і аўтамашын знішчана 4000 фрыцаў.

Так ваююць народныя мсціўцы--партызаны атрада „Барба". Яны змагаюцца за свабодную Совецкую Беларусь.

М—ў.

## Паветраныя бандыты

Фашысцкія паветраныя бандыты зноў пачалі бамбардыраваць нашы беларускія вёскі. У мінулым тыдні фашысцкая авіяцыя бамбардыравала вёскі: Каменскую Слабаду, Капуснікі, Стаецкія, Ганцавічы — Плешчаніцкага р-на; Клюндзеўку, Засценак, Гарэлы Луг, Замошша— Бягомельскага раёна. У Каменскай Слабадзе ёсць шмат забітых і параненых сярод мірнага насельніцтва.

Насельніцтва вёсак павінна быць заўсёды пільным. Пры з'яўленні варожых самалётаў патрэбна хавацца самім і хаваць сваю маёмасць.

А. В.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ